ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 СНЕЖНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 234 (28092) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Дзяўчына з байцоўскім характарам




Цераз церні ўбачыць даўнішняе



Як стаць эльфам 80-га ўзроўню?

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Леанід ГУЛЯКА, Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей:**

*«Грамадская згода — гэта бясцэннае духоўнае багацце Беларусі, таму, нягледзячы на ўсе нашы сённяшнія складанасці, прадстаўнікі розных народаў, прыхільнікі розных канфесій павінны быць і ў будучыні забяспечаны камфортнымі ўмовамі ў нашай дзяржаве. У краіне не выяўлена дзейнасць радыкальных рэлігійных арганізацый і іх прадстаўнікоў. У сувязі з гэтым грамадскае меркаванне ў дачыненні да ўсіх рэлігійных арганізацый застаецца пазітыўным».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.12.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18085,00 | ▲ |
| Еўра | 19204,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 271,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 758,28 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# «РЫБНЫ ДЗЕНЬ»






**Мінчанам даўно палюбіліся рыбныя кірмашы, якія рэгулярна праходзяць у розных раёнах сталіцы. Адзін з іх быў арганізаваны днямі ў Маскоўскім раёне. Сваю прадукцыю тут прадставілі айчынныя рыбаводчыя арганізацыі — прычым па цэнах ад вытворцаў. «Рыбны дзень» удаўся на славу!**

Фота БЕЛТА.

# РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

**Інваліднасць — гэта, верагодна, лёс. З ёю ў свеце жыве прыкладна адзін мільярд людзей — гэта каля 15% ад усяго насельніцтва планеты. У нашай краіне людзей з інваліднасцю — больш за паўмільёна. Звычайна яны з удзячнасцю прымаюць дапамогу, але не любяць і не прымаюць шкадавання. «Мы такія ж, як і ўсе іншыя», — сцвярджаюць яны. І марацць быць на роўных са здаровымі: працаваць, быць карыснымі, а задача грамадства — падтрымаць іх. Менавіта на гэта і скіравана сацыяльная палітыка ўсіх дзяржаў свету, у тым ліку і нашай.**

СТАР. 4



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Фінансавыя тэхналогіі

# БАНКІ САРЫЕНТУЮЦЬ НА «ЛІЧБУ»

**Эксперты Нацбанка ўпэўнены, што новая сістэма ідэнтыфікацыі кліентаў павялічыць канкурэнцыю ў фінансавай сферы і знізіць кошт банкаўскіх паслуг і прадуктаў**

**Налета ў кастрычніку ў нашай краіне пачне сваё функцыянаванне міжбанкаўская сістэма ідэнтыфікацыі (МСІ), стварэнне якой прадугледжана Указам кіраўніка дзяржавы ад 1 снежня 2015 года № 478 «Аб развіцці лічбавых банкаўскіх тэхналогій». З пачаткам працы МСІ у краіне будуць створаны ўмовы для развіцця лічбавай трансфармацыі банкаўскага сектара, пра што паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка Беларусі.**

## АДЗІНЫ «ФЭЙС-КАНТРОЛЬ» ДЛЯ КЛІЕНТАЎ

Зразумела, што ўкараненне найноўшых лічбавых тэхналогій у банкаўскай сферы — агульнасусветны трэнд, які падтрымліваецца і айчыннымі банкамі. Таму сёння ў свеце ўсё больш банкаўскіх паслуг аказваюцца пры дапамозе дыстанцыйных каналаў і далейшая лічбавая трансфармацыя магчыма толькі з рашэннем пытання па міжбанкаўскай ідэнтыфікацыі кліентаў. Спецыялісты рэгулятара адзначаюць, што менавіта яе адсутнасць з'яўляецца асноўным бар'ерам на шляху доступу фізічных і юрыдычных асоб (кліентаў) да банкаўскіх паслуг і прадуктаў з дапамогай дыстанцыйных (лічбавых) каналаў узаемадзеяння.

Эксперты фінансавай сферы ўпэўнены, што фарміраванне МСІ дазволіць кліентам банкаў, аднойчы прайшоўшы працэдуру ідэнтыфікацыі асабіста ў адным з банкаў, атрымліваць банкаўскае абслугоўванне з дапамогай дыстанцыйных каналаў у любым беларускім банку ў зручны час. Такім чынам, цяпер жыхарам нашай краіны стануць даступны паслугі, якія аказваюцца беларускімі банкамі, незалежна ад наяўнасці ў іх населеных пунктах аддзяленняў банкаў.

## БАНКАЎСКІЯ ПАСЛУГІ — НЕ ВЫХОДЗЯЧЫ З ДОМУ

«У якасці тэхналагічнай базы для фарміравання МСІ выступае адзіная разліковая і інфармацыйная прастора Рэспублікі Беларусь (АРІП)», — гаворыцца ў паведамленні Нацбанка. Спецыялістамі рэгулятара ўдакладняецца, што адначасова з прыняццем указа №478 будзе ўдасканалены механізм аказання банкамі паслуг і ажыццяўлення банкаўскіх аперацый.

СТАР. 2